ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1979 г.
18 кастрычніка
ЧАЦВЕР
№ 29 (1255)

Цана 2 кап.

## НАВІНЫ БДУ

### Справаздачы і выбары

у прафсаюзных арганізацыях нашага універсітэта працягваюцца.

Ужо прайшлі канферэнцыі і сходы на факультэтах радыёфізікі і электронікі, хіміі, гісторыі, журналістыкі.

З вялікай адказнасцю і павагай аднасяцца студэнты да выбару тых, хто стане членам прафсаюзнага бюро. Напрыклад, на гістарычным факультэце з 12 прадстаўнікоў прафбюро 7 — члены КПСС, усе яны вучацца толькі на добра і выдатна.

Зараз ідзе падрыхтоўка да выбараў і на іншых факультэтах.

### Навуковая канферэнцыя

выкладчыкаў і студэнтаў, прысвечаная 30-годдзю ўтварэння Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, адбылася на гістарычным факультэце.

Ганаровым госцем гэтай канферэнцыі быў прафесар Іенскага універсітэта імя Фрыдрыха Шылера М. Вайсбекер.

Перад прысутнымі з дакладам «Сацыялістычнай ГДР — 30 гадоў» выступіў дацэнт М. Г. Елісееў.

Аб сацыяльна-эканамічным развіцці краіны пасля IX з'езда САПГ, удзеле моладзі ГДР у будаўніцтве развітога сацыялістычнага грамадства, барацьбе сацыялістычнай нямецкай дзяржавы за палітыку мірнага сусіснавання з капіталістычнымі краінамі расказалі ў сваіх выступленнях студэнтка з ГДР К. Рубах, савецкія студэнты С. Янчук і В. Міхальчук.

### Дружна, з агеньчыкам

працавалі студэнты гістарычнага факультэта на ўдарнай камсамольскай будоўлі горада Мінска — крытым кірмашы.

Юнакі і дзяўчаты іншых факультэтаў таксама вырашылі не заставацца ў баку, і з 22 па 26 кастрычніка яны прадоўжаць гэта выдатнае пачынанне. Па 50 чалавек ад механіка-матэматычнага, філалагічнага, геаграфічнага, фізічнага факультэтаў і ФПМ будуць працаваць на алімпійскіх аб'ектах горада.

110-й ГАДАВІНЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ У. І. ЛЕНІНА — ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ

# Калі табе камсамолец імя...

Камсамольцы — народ не толькі вясёлы, але і сур'ёзны. Гэтыя якасці дапамагаюць ім і ў гарачае будатрадаўскае лета, і ў час здачы сесіі, і ў грамадскай дзейнасці.

Як жа жывуць камсамольцы навукова-даследчай лабараторыі сацыялагічных даследаванняў і сектара прыкладной сацыялогіі БДУ імя У. І. Леніна?

Усяго ў калектыве 31 чалавек. Гады сумеснай работы здружылі, загартавалі калектыў. А таму і цікавае камсамольскае жыццё ў арганізацыі. Васіль Курловіч — камсамольскі важак. Гэта вялікая адказнасць, але Васіль не губляецца, хаця спраў нямала.

Вялікую ролю ў жыцці арганізацыі адыгрывае іх «Камсамольскі пражэктар». Усе памятаюць яркія выпускі насценгазеты. Напрыклад, фотастэнд, прысвечаны камуністычнаму суботніку. У штабе «Камсамольскага пражэктара» — народ дружны і адказны. Работы ў штаба шмат: гэта і рэйды-праверкі па арганізацыі і правядзенню суботнікаў, і рэйды па грамадска-палітычнай актыўнасці камсамольцаў, і падвядзенне вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва, і святочныя выпускі газеты, прысвечаныя знамянальным датам. Актыўны ўдзел усе камсамольцы прымаюць у правядзенні палітінфармацый, лекцый, сустрэчах з цікавымі людзьмі, ушанаўванні ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія працуюць у лабараторыі.

Камсамольцы нашай арганізацыі — старшыя і малодшыя навуковыя супрацоўнікі, лабаранты. Многія з іх вучацца ва універсітэце марксізму-ленінізму, аспірантуры, у інстытутах.

Нядаўна у камсамольскую арганізацыю ўліліся новыя людзі — Мікалай Касачоў, Уладзімір Палікарпаў і Валянціна Ерашова. Хваляваліся, як сустрэнуць іх. Але гэта было дарэмным. Праз некаторы час пасля знаёмства яны ўсе разам вялі размову аб далейшым паляпшэнні камсамольскай работы.

Камсамольска - маладзёжны суботнік, прысвечаны XI Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване, сельскагаспадарчыя работы, культурнамасавыя мерапрыемствы, прысвечаныя 60-годдзю Савецкай Арміі, Дню Перамогі, культпаходы ў тэатры, кіно, сустрэчы з рэжысёрамі і акцёрамі тэатра імя Янкі Купалы — гэта было.

А што ў планах? Вядома, што яшчэ больш цікавае і насычанае жыццё.

Мікраклімат у калектыве... Як цяжка часам зацікавіць камсамольцаў, абавязаць іх да выканання грамадскіх даручэнняў. Бывае так: быццам і сакратар стараецца з усіх сіл, а калектыву дружнага няма. Як жа зацікавіць членаў калектыву, як згуртаваць іх у адзіную дружную камсамольскую сям'ю? Гэта, безумоўна, залежыць ад саміх камсамольцаў, ды і вопыту, назапашанага камсамольскай арганізацыяй. Аб добрым клімаце, правільнай рабоце арганізацыі гаворыць той факт, што па выніках грамадска-палітычнай атэстацыі шэсць камсамольцаў камітэтам камсамола Белдзяржуніверсітэта былі ўзнагароджаны значком «Удзельнік Ленінскага заліку», трое камсамольцаў за актыўную грамадскую работу — значкамі «Ударнік ВЛКСМ».

І яшчэ ёсць цікавая работа ў камсамольцаў. Пры арганізацыі створана лектарская група. І тут шмат пачынанняў, якія захапляюць усіх супрацоўнікаў. Вядома, трэба шмат працаваць: патрэбна ўмець чытаць, умець паднесці тэму. А гэтаму трэба вучыцца, рыхтавацца.

Камсамольцы таксама працавалі ў калгасе, дапамагалі рыхтаваць корм жывёле на зіму. З першага дня пачалося сацыялістычнае спаборніцтва. Закіпела работа. Кожны стараўся не адставаць. Але першай заўсёды была Лена Прылепка. Нават хлопцы здзіўляліся: адкуль у гэтай мілай дзяўчынкі столькі энергіі і запалу!

Праца хутчэй спорыцца, калі песня гучыць. Увесь час не змаўкалі над полем вясёлыя галасы камсамольцаў. І калі што не ладзілася з непрывычкі ў працы, дапамагалі ўсе пасяброўску. А вечарамі ля кастра пачыналіся размовы, спрэчкі, песні пад гітару. І гэты працоўны дэсант, і шмат іншых спраў згуртавалі камсамольцаў, дазволілі ім ацаніць дружбу, узаемавыручку, падтрымку сяброўскага пляча.

31 камсамолец. Кожны — індывідуальны, яркі характар. У кожнага свае інтарэсы, клопаты, справы. Але ўсіх аб'ядноўваюць іх агульныя камсамольскія справы, сяброўства. А камсамольскае сяброўства — самае моцнае і вернае.

І. ГІЗАТУЛІНА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

# Савет трымаюць камуністы

**10 кастрычніка адбыўся сход партыйнага актыву Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна з парадкам дня «Аб задачах партыйнай арганізацыі універсітэта па выкананню пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў» і XIX пленума ЦК КПБ». З дакладам, які мы публікуем у скарачэнні, выступіў сакратар парткома БДУ імя У. І. Леніна М. С. Гарашчук.**

Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў, а таксама матэрыялы XIX пленума ЦК КПБ з'яўляюцца праграмнымі дакументамі, разлічанымі на доўгатэрміновую перспектыву. У іх дана выразная праграма развіцця вышэйшай школы, паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, павышэння ўзроўню навуковых даследаванняў і ўкаранення іх у народную гаспадарку.

Перад рэктаратамі, партыйнымі арганізацыямі пастаўлена задача сканцэнтраваць намаганні прафесараў і выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў на паляпшэнні вучэбна-выхаваўчай і навукова-метадычнай работы.

Выконваючы рашэнні XXV з'езда, універсітэт дабіўся значных поспехаў у падрыхтоўцы ідэйна-палітычнай загартоўцы маладых спецыялістаў, у павышэнні эфектыўнасці навуковых даследаванняў. Як адзначыў П. М. Машэраў у дакладзе на XIX пленуме ЦК КПБ, «партыйныя арганізацыі, рэктараты Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна... і іншых ВНУ праводзяць значную работу па ўдасканаленню навучання і выхавання будучых спецыялістаў». Безумоўна, гэта ацэнка работы універсітэта радуе нас і да многага абавязвае.

Разам з тым, у пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў ставіцца задача аб далейшым павышэнні ролі універсітэтаў. Прадугледжваецца здзейсніць меры па развіццю універсітэтаў як вядучых вучэбна-метадычных і навуковых цэнтраў вышэйшай школы. Умацаваць іх матэрыяльна-тэхнічную базу і састаў навукова-педагагічных кадраў. Пастаўлена задача палепшыць падрыхтоўку, размеркаванне і павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук ва універсітэтах.

У святле гэтых патрабаванняў узрастае роля нашага універсітэта як аднаго з буйнейшых цэнтраў рэспублікі ў падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў і спецыялістаў для народнай гаспадаркі. Як вышэй было сказана, наш універсітэт у апошнія гады дабіўся значных поспехаў. Аднак сёння нам трэба гаварыць менш аб дасягненнях, а сканцэнтраваць увагу на нявырашаных пытаннях, праблемах і шляхах іх рашэння. Гэтаму павінна быць падпарадкавана ўся арганізатарская і выхаваўчая работа камуністаў, усіх членаў калектыву.

Прадметам пэўных турбот партыйнай арганізацыі, адміністрацыі і грамадскіх арганізацый з'яўляецца далейшае ўдасканаленне вучэбна-выхаваўчага працэсу. Прама скажам, праводзіцца вялікая работа па паляпшэнню вучэбнага працэсу як на факультэтах, так і ў цэлым ва універсітэце.

Калі прааналізаваць вынікі паспяховасці за апошнія гады, напрыклад, у X пяцігодцы, то абсалютная паспяховасць па універсітэту мела тэндэнцыю да ўзрастання і з 1976 года павялічылася на 0,3 працэнта.

Сёння яна стабілізавалася. У вясеннюю сесію абсалютная паспяховасць у сярэднім па універсітэту на стацыянары была 93,7 працэнта, па грамадскіх дысцыплінах яна склала 99,4 працэнта.

Аналіз якасці падрыхтоўкі нашых выпускнікоў на некаторых факультэтах паказвае, што няма прыкметнага росту паспяховасці ад курса к курсу. Бываюць выпадкі, калі колькасць выдатнікаў на старэйшых курсах становіцца меншай, чым іх было ў гэтым жа наборы на першым курсе.



(Заканчэнне на 2-й стар.).

# САВЕТ ТРЫМАЮЦЬ КАМУНІСТЫ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).**

Думаецца, што гэта вельмі сур'ёзная праблема, якая прыводзіць да пэўных вывадаў у ацэнцы нашай работы, работы спецыялізуючых кафедр і заслугоўвае пастаяннага клопату рэктарата, партыйнай і грамадскіх арганізацый.

**У арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу мы павінны ўлічваць той факт, што вышэйшая адукацыя ў вачах моладзі сёння ў некаторай меры страціла той арэол выключнасці, якім яна была акружана раней. Таму выкладчыкам патрэбна ўдзяляць асаблівую ўвагу развіццю ў студэнтаў інтарэсаў да вучобы, навукі і выбранай спецыяльнасці. Нам неабходна больш увагі ўдзяляць студэнтам-выдатнікам. Паспяховасць, узровень падрыхтоўкі студэнтаў— гэта не толькі іх асабістыя поспехі, але і вынік педагагічнай работы ўсяго нашага калектыву.**

Зараз з асобай сілай гучаць словы У. І. Леніна аб тым, што ва ўсякай школе самы важны— ідэйна-палітычны напрамак лекцый.

Асаблівую ролю ў рэалізацыі гэтага патрабавання павінны сыграць кафедры, як галоўнае звяно ВНУ, якія вызначаюць змест і адзінства вучэбнага, навуковага і выхаваўчага працэсаў.

Аднак яшчэ не ўсе кафедры надаюць належнае значэнне лекцыям як асноўнаму віду вучэбнага працэсу. Асобныя высокакваліфікаваныя спецыялісты (прафесары і дацэнты) чытаюць лекцыйныя курсы ўсяго ў аб'ёме 40—70 часоў. У той жа час чытанне лекцыйных курсаў даручаецца выкладчыкам без вучоных ступеней і званняў. Так, напрыклад, на кафедры гісторыі філасофіі і логікі 5 выкладчыкаў з вучонымі ступенямі і званнямі ў мінулым вучэбным годзе прачыталі лекцый менш, чым астатнія 4 выкладчыкі гэтай кафедры без вучонай ступені і звання (5 прафесараў і дацэнтаў прачыталі 519 гадзін, а 4 выкладчыкі без ступені і звання — 688 гадзін). Такое ж становішча на кафедры марксісцка-ленінскай этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму. Каментарыі тут, як гаворыцца, не патрэбны.

Улічваючы ўзрастаючыя патрабаванні да якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, рацыянальнага спалучэння іх тэарэтычных ведаў з магчымасцю рашаць практычныя пытанні, пастановамі ЦК КПСС і Савета Міністраў і XIX пленума ЦК КПБ прызнана неабходным далейшае расшырэнне і ўмацаванне сувязей вышэйшых навучальных устаноў з навукова-даследчымі інстытутамі і адпаведнымі галінамі народнай гаспадаркі.

За апошнія гады атрымалі больш шырокае развіццё сувязі універсітэта з многімі навуковымі ўстановамі, арганізацыямі і прадпрыемствамі. Сярод іх—ВА «Інтэграл», інстытуты і аддзелы АН БССР.

Сёння падрыхтоўка студэнтаў па шэрагу спецыяльнасцей вядзецца на навуковай і вытворчай базе арганізацый і прадпрыемстваў. Так, студэнты, якія займаюцца па спецыяльнасці мікраэлектроніка, выконваюць спецпрактыкум у лабараторыях ВА «Інтэграл». Падрыхтоўка студэнтаў па спецыяльнасці цеплафізіка забяспечваецца на базе інстытута цепла- і масаабмену АН БССР. У мінулым годзе у інстытутах АН БССР было выканана 111 дыпломных работ.

Разам з тым, у святле рашэнняў ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР і XIX пленума ЦК КПБ нам неабходна ўзмацніць сувязі з АН БССР, вытворчымі аб'яднаннямі.

**Вучэбная работа дае плён тады, калі яна падмацоўваецца навукова-даследчай. За апошнія гады ва універсітэце атрымала далейшае развіццё навукова-даследчая работа студэнтаў. У гэтай рабоце ў 1978 годзе ўдзельнічала 79 працэнтаў студэнтаў. На жаль, як паказалі сацыялагічныя даследаванні, самі студэнты лічаць, што гэты працэнт завышаны.**

Развітой формай удзелу студэнтаў у навуковых даследаваннях з'яўляецца работа ў СНДЛ. Так, у 1978 годзе ў 14 СНДЛ працаваў 661 студэнт.

Нас радуе актывізацыя навуковых даследаванняў студэнтаў па грамадскіх навуках. У мінулым годзе на заключны этап VII Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднаму маладзёжнаму руху прадстаўлена 19



работ. Гэта некалькі больш папярэдняга. Вельмі добра праходзяць штогадовыя навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Сёння ідзе ўжо дзейсная падрыхтоўка да 110-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна.

Аднак гэтыя паказчыкі характарызуюць у асноўным шырыню ахопу студэнтаў навукова-даследчай работай. Больш дакладны аналіз становішча паказвае, што ў нас аслаблена ўвага да паглыблення падрыхтоўкі студэнтаў да навукова-даследчай дзейнасці. Аб гэтым сведчыць той факт, што на працягу шэрагу гадоў універсітэт са значнымі цяжкасцямі камплектуе вочную аспірантуру з ліку выпускнікоў.

З году ў год паніжаецца адносная доля заахвочванняў нашых студэнтаў у адносінах да студэнтаў галіновых ВНУ на ўсесаюзных і рэспубліканскіх аглядах-конкурсах.

Думаецца, што ва універсітэце ёсць рэзервы, якія можна паступова прыводзіць у дзеянне, прыцягваючы студэнтаў да новых форм заняткаў, навучаючы і выхоўваючы іх творчасцю.

У БДУ накоплены вялікі вопыт арганізацыі і правядзення ідэйна-выхаваўчай работы, склалася пэўная сістэма камуністычнага выхавання студэнтаў.

Патрабаванні комплекснага падыходу да пытання выхавання, пастаўленыя XXV з'ездам КПСС, у нас увасоблены ў распрацаваную «Комплексную праграму ідэйна-выхаваўчай работы са студэнтамі на пяцігадовы перыяд навучання ва універсітэце».

Сэрцавінай ідэйна-выхаваўчай работы з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў марксісцка-ленінскага светапогляду. Таму ва ўсіх раздзелах праграмы прадугледжваецца выдзяленне сацыяльна-светапоглядных аспектаў. Гэтаму падпарадкоўваецца і вучэбны працэс.

Напрыклад, прафесар Е. Ф. Лунец пры чытанні лекцый па спецыяльнасці біяхімія глыбока асвятляе ўдзел рускіх і савецкіх вучоных у развіцці фізіялогіі, паказвае значэнне рашэнняў партыі і ўрада, пачынаючы з першага ленінскага дэкрэта аб паўлаўскіх лабараторыях да рашэнняў аб развіцці важнейшых напрамкаў тэарэтычнай і прыкладной фізіялогіі, для развіцця савецкай навукі.

Дацэнт В. Т. Шалатонін пры чытанні курса «Фізіялогія чалавека і жывёл» асаблівую ўвагу ўдзяляе ўплыву марксісцка-ленінскай філасофіі на развіццё фізіялагічных тэорый, раскрывае вытокі фізіялагічнага ідэалізму ў яго разнастайных сучасных праяўленнях на аснове ленінскай тэорыі адлюстравання.

ВНУ, здольная стаць сапраўднай кузняй сучасных кадраў, павінна мець у сваім распараджэнні высокакваліфікаваных выкладчыкаў, якія займаюцца навукай, добрай навуковай базай, павінна быць развітым вучэбна-навуковым комплексам. Каштоўнасць навукова-даследчай работы выкладчыка ВНУ заключаецца зараз не толькі ў тым, што яна з'яўляецца непарушнай умовай неабходнага навукова-тэхнічнага ўзроўню навучання студэнтаў, але і ў тым, што ўносіць немалы ўклад у рашэнне народнагаспадарчых задач, фундаментальных і прыкладных праблем навукі.

Навуковай дзейнасці ВНУ, а тым больш універсітэтам, партыя надае важнае значэнне. Універсітэт павінен рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў з навыкамі навукова-даследчай работы, навуковыя кадры для многіх галін народнай гаспадаркі.

Вось чаму, як гаварыў на XIX пленуме ЦК КПБ М. М. Машэраў, разам з АН БССР трэба ўзнімаць ролю БДУ як цэнтра вялікай навукі і падрыхтоўкі навуковых кадраў. У святле гэтых задач мы і павінны будаваць сваю работу.

**Універсітэт валодае вялікім навуковым патэнцыялам. Сёння ў сваім саставе ён мае два навукова-даследчыя інстытуты, 3 праблемныя і 6 галіновых навукова-даследчых лабараторый, ВЦ. У апошнія гады асноўная ўвага была накіравана на больш шырокі ўдзел універсітэта ў выкананні даследаванняў адпаведна з дзяржаўнымі планамі эканамічнага і сацыяльнага развіцця, праграмамі работ па рашэнню асноўных навукова-тэхнічных праблем, канцэнтрацыі сіл і сродкаў на рашэнне важнейшых задач.**

Аб канцэнтрацыі сіл і сродкаў на найбольш важных навуковых напрамках сведчыць агульнае памяншэнне колькасці тэм НДР з павелічэннем важнейшай тэматыкі.

**Так, калі ў 1977 годзе ўсяго выконвалася 571 (у тым ліку па гасдагавору — 161), то ў 1979 годзе запланавана 475 тэм (у тым ліку па гасдагавору—139).**

**У 1978 годзе ў народную гаспадарку былі ўкаранёны вынікі 70 НДР з фактычным эканамічным эфектам 6831,9 тысячы рублёў пры плане 5030 тысяч рублёў.**

**У 1979 годзе, за перыяд студзень—жнівень, па выніках даследаванняў у Дзяржкамітэт па справах адкрыццяў і вынаходніцтваў накіравана на разгляджанне 114 заявак, атрымана 65 станоўчых рашэнняў. Атрымана ўзнагарод на выстаўках: на ВДНГ СССР залатых — 2, сярэбраных—1, бронзавых—6 медалёў; на ВДНГ БССР: дыпломаў I ступені—2, дыпломаў II ступені—4, дыпломаў III ступені—4.**

Адпаведна з пастановай Дзяржкамітэта па навуцы і тэхніцы пры СМ СССР распрацаваны новы спосаб атрымання цеплаізаляцыйнага матэрыялу, які абаронены 9 аўтарскімі пасведчаннямі і патэнтуецца ў ЗША, ФРГ, Францыі, Японіі і Канадзе.

Белдзяржуніверсітэт звязаны 111 дагаворамі аб навуковым, вучэбна-навукова-вытворчым і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве з многімі навуковымі ўстановамі, арганізацыямі і прадпрыемствамі.

Разам з тым, пры дэталёвым аналізе арганізацыі навуковых даследаванняў, іх эфектыўнасці відаць, што выкарыстаны далёка не ўсе магчымасці.

У плане рэалізацыі пастановы ЦК КПСС і СМ СССР ад 6 красавіка 1978 года «Аб павышэнні эфектыўнасці навукова-даследчай работы ў вышэйшых навучальных установах» і пастановы ЦК КПБ пачата работа па ўдасканаленню структуры арганізацыі і кіравання навукова-даследчай работай ва універсітэце, гэта значыць па стварэнню навукова-тэхнічнага цэнтра. Гэта дазволіць з адзіных пазіцый аб'яднаць планаванне і выкананне дзяржбюджэтных і гасдагаворных тэм, шырэй выкарыстоўваць навуковы патэнцыял прафесарска-выкладчыцкага саставу кафедр і калектываў НДР.

Па меры паглыблення навукова-тэхнічнай рэвалюцыі значна ўзрастае роля кадраў. Паспяховае выкананне задач, пастаўленых перад ВНУ ў пастановах ЦК КПСС і СМ СССР, XIX пленума ЦК КПБ, у многім залежыць ад правільнага выкарыстання кадраў, ад таго, як рэалізуецца прынцып партыйнасці ў падборы, расстаноўцы і выхаванні кадраў усіх звенняў. Кадравая палітыка ва ўмовах ВНУ з'яўляецца складаным, я б сказаў, творчым працэсам.

**Усяго ва універсітэце налічваецца каля 3 тысяч навукова-педагагічных работнікаў і аспірантаў, з іх 1338—прафесарска-выкладчыцкага саставу. Са 105 кафедр 50 узначальваюць дактары навук і прафесары (48 працэнтаў); на 13 кафедрах няма загадчыкаў. З 1338 выкладчыкаў маюць вучоныя ступені і званні 655 чалавек, каля 48 працэнтаў (дактароў навук і прафесараў — 80, кандыдатаў навук і дацэнтаў — 575).**

Як я ўжо гаварыў, у нас амаль адсутнічае на прыродазнаўчых факультэтах паняцце прафесар кафедры. У апошнія гады няма абарон доктарскіх дысертацый. Гэта вельмі дрэнна, бо пастановы ЦК КПСС і ЦК КПБ адводзяць універсітэтам ролю цэнтраў падрыхтоўкі навукова-даследчых кадраў, вядома, не толькі для сябе, але і для рэспублікі, краіны.

Мы разумеем, што функцыі выкладчыка ў сучаснай вышэйшай школе маюць тэндэнцыю да ўскладнення, але лічым, што для многіх выкладчыкаў спаборніцтва на атрыманне першай і нават другой вучонай ступені з'яўляецца рэальным.

Партыйным арганізацыям патрэбна ўважліва разабрацца ў становішчы, якое склалася з абаронай доктарскіх дысертацый. Перавод на пасаду навуковага супрацоўніка для спаборніцтва на атрыманне вучонай ступені доктара навук павінен быць не толькі жаданнем спаборніка, а вынікам яго рэальных навуковых дасягненняў.

**Важным сродкам навуковага патэнцыялу універсітэта з'яўляецца аспірантура. Сёння мы не можам задаволіцца яе работай. Конкурс сярод паступаючых у апошнія гады невялікі, а па шэрагу прыродазнаўчых спецыяльнасцей наогул адсутнічае. У цэлым параўнальна нізкая эфектыўнасць работы аспірантуры. Так, напрыклад, у 1976 годзе скончыла аспірантуру з прадстаўленнем дысертацыі да абароны 9,8 працэнта, у 1977 годзе—12,5 працэнта, а вось у 1978 годзе — толькі 6,7 працэнта аспірантаў.**

У аспірантуры для кожнага аспіранта ёсць кіраўнік. Больш таго, кіраўнік, як правіла, падбірае сабе аспіранта, аспірант — кіраўніка. Мы не схільны меркаваць, што ў кожным асобным выпадку ўсё залежыць ад кіраўніка. Але ніхто не можа адмаўляць яго ролі ў выбары актуальнай тэмы, навучання і выхавання аспіранта. У адных кіраўнікоў паспяхова ідзе абарона дысертацый яго аспірантамі, у іншых — не.

Як бачыце, таварышы, партыйнай арганізацыяй зроблена нямала, але на ўсіх участках нашай работы маюць месца і істотныя недахопы, нявыкарыстаныя магчымасці і рэзервы. І наш найпершы абавязак заключаецца ў тым, каб прывесці ў дзеянне ўсе рэзервы і магчымасці і паспяхова вырашыць задачы, якія вынікаюць з пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў» і пленума ЦК КПБ.

# На прыз газеты «Беларускі універсітэт»

Штогод у парку Перамогі праводзіцца восеньскі лёгкаатлетычны крос, які ўключаны ў праграму XXVIII агульнауніверсітэцкай спартакіяды.

Галоўнай мэтай кросу з'яўляецца далейшае ўдасканаленне спартыўнага майстэрства студэнтаў, выяўленне найбольш здольных спартсменаў з ліку паступіўшых на першыя курсы і прапаганда фізкультуры і спорту ва універсітэце. Усе факультэты выстаўляюць неабмежаваную колькасць удзельнікаў. У залік будуць ісці 20 працэнтаў ад агульнай колькасці студэнтаў, якія займаюцца на факультэтах.

Каманда-пераможца ўзнагароджваецца пераходным кубкам і Ганаровай граматай рэктарата.

Каманды, якія занялі другое і трэцяе месцы, узнагароджваюцца Ганаровымі граматамі рэктарата.

**У гэтым годзе рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» зацвярджае пераходны кубак для факультэта-пераможцы сярод студэнтаў першых курсаў.**

Крос адбудзецца 21 кастрычніка. Запрашаем студэнтаў прыняць актыўны ўдзел у лёгкаатлетычным кросе. Усе на старт!



**На здымку:** пераходны кубак для факультэта-пераможцы сярод студэнтаў першых курсаў, зацверджаны рэдакцыяй газеты «Беларускі універсітэт».

# З компасам і картай

Ёсць людзі, якія амаль нічога не ведаюць аб спартыўным арыентаванні. Адным здаецца, што гэта вельмі заблытаны і незразумелы від спорту. Другія разумеюць пад ім славутае «паляванне на ліс». А між іншым, кажучы проста, спартыўнае арыентаванне — гэта спаборніцтва ва ўменні пры дапамозе компаса і падрабязнай карты хутка рухацца на незнаёмай мясцовасці.

Адрозніваюць два розныя па характару віды спартыўнага арыентавання: арыентаванне па выбару і арыентаванне на маркіраванай трасе. Першае заключаецца ў тым, каб спартсмен за пэўны час наведаў найбольшую колькасць КП і набраў як мага больш балаў. Другое — у адшуканні КП і дакладным нанясенні іх на карту. За кожную памылку — штраф.

Першыя спаборніцтвы па арыентаванню праходзілі ў Швецыі ля Стакгольма. Але афіцыйна лічыцца, што арыентаванне нарадзілася ў 1897 годзе ў Нарвегіі.

У нашай краіне першыя спаборніцтвы былі праведзены пад Ленінградам у 1939 годзе, але яны мелі характар маршкідка турысцкай групы. І толькі ў 1968 годзе, у Карпатах, адбылося першае Усесаюзнае першынство. Зараз колькасць прыхільнікаў гэтага віду спорту няспынна павялічваецца. Якія ж якасці, уласцівыя спартыўнаму арыентаванню, спрыяюць гэтаму росту?

Па-першае —арганічнае спалучэнне фізічнага і разумовага пачаткаў. Па-другое — яго выключна фізкультурна-аздараўленчы характар.

Трэцяя якасць спартыўнага арыентавання заключаецца ў тым, што ў спаборніцтвах на роўных і на сур'ёзным узроўні (першынство краіны, чэмпіянат свету) маюць магчымасць спрачацца спартсмены шырокага ўзроставага дыяпазону — ад 20 да 50 год. У сувязі з гэтым можа вырашыцца адна з галоўных задач сённяшняга дня— прыцягненне да фізічнай культуры ўсіх узроставых катэгорый.

Спартыўнае арыентаванне — гэта не толькі бег, гэта яшчэ і захапляючая гульня з інтрыгуючым сюжэтам. Яна праходзіць на прыродзе, у баку ад пыльных і шумных гарадоў.

Запрашаем вас у свет спартыўнага арыентавання.

**В. СТАС.**

# Старажытны Звод законаў

У ЛІСТАПАДЗЕ гэтага года ў горадзе Вільнюсе адбудзецца навуковая канферэнцыя вучоных Літвы, Беларусі, Украіны, прысвечаная праблемам вывучэння Статута 1529 г. Яна падвядзе вынікі ўжо зробленага і наменіць канкрэтныя задачы па вывучэнню старажытнага еўрапейскага Звода законаў. У рабоце канферэнцыі прымуць удзел вядучыя спецыялісты-гісторыкі, правазнаўцы. Сярод іх намеснік дэкана юрыдычнага факультэта БДУ дацэнт І. А. Юхо, аўтар нядаўна надрукаванай манаграфіі «Прававое становішча насельніцтва Беларусі ў XVI стагоддзі».

450 гадоў прайшло з таго часу, калі быў уведзены ў дзейнасць першы Літоўскі Статут. Паяўленне яго было падрыхтавана ўсім ходам сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх і літоўскіх зямель у XV—XVI стагоддзях. Развіццё прадукцыйных сіл, рост гандлю і пашырэнне ўнутрыдзяржаўных сувязей у канцы XV і пачатку XVI стагоддзяў выклікалі неабходнасць прывесці ў адзіную сістэму прававыя нормы, стварыць адзінае для ўсёй дзяржавы права.

Асноўнымі крыніцамі Статута 1529 года былі звычайнае права, нормы, якія змяшчаюцца ў Сеймавых канстытуцыях і прывілеях. Пэўны ўплыў аказалі на складальнікаў Статута нормы «Русской правды» і нямецкага права.

Статут 1529 года з'яўляецца першым у Еўропе Зводам законаў, у якім сабраны і паслядоўна выкладзены нормы дзяржаўнага, зямельнага, адміністрацыйнага, грамадзянскага, сямейнага, крымінальнага і іншых галін права. Змест усіх артыкулаў Статута накіраваны на ахову інтарэсаў і маёмасці пануючага класа, на пашырэнне правоў і прывілей феадалаў, на занявольванне сялян.

Аднак паяўленне Статута 1529 года сведчыла і аб значнай ступені развіцця прававой тэорыі і заканадаўчай тэхнікі, падкрэслівала суверэннасць дзяржавы.

Статут Вялікага княства Літоўскага дае даследчыкам шырокі і рознабаковы матэрыял у галіне сацыяльна-эканамічнай гісторыі беларускага і літоўскага народаў, гісторыі іх права і беларускай мовы, на якой ён быў напісаны.

Вучоныя БССР і Літоўскай ССР, якія аддаюць вялікую ўвагу вывучэнню Статутаў Вялікага княства Літоўскага, выдалі ў 1961 годзе поўны тэкст Статута 1529 года, дапоўніўшы яго перакладам на сучасную рускую мову, падрабязнымі каментарыямі і слоўнікам.

**Б. КАПЫСКІ,**
**аспірант кафедры гісторыі БССР.**




(Заканчэнне. Пачатак у № 28).

**24 ЛІПЕНЯ.**

У атрадзе свята. Здадзены наш першы асноўны аб'ект — кацельня! На ўрачыстай лінейцы права падняць сцяг Беларускай ССР было прадастаўлена брыгадзіру-муляру Паўлу Стасевічу, а сцяг Усесаюзнага студэнцкага атрада — лепшаму стропальшчыку Уладзіміру Андрыевічу. Выпушчаны «маланкі», спецыяльны выпуск фотагазеты. Начальнік радыёвузла Сяргей Сасім падрыхтаваў радыёгазету, якую трансліраваў у абедзенны перапынак. Нашы повары Таццяна Барадзіч і Наташа Расоха прыгатавалі святочны абед. Атрад віншавалі ўсе. Прараб толькі ўсміхаўся: «Калі прызнацца — не спадзяваўся, асабліва пры ўражанні ад першай сустрэчы». Заўтра брыгада пераходзіць на другі аб'ект — мазутанасосную для кацельні, фундамент якой падрыхтавала брыгада Алеся Усені. А вечарам мы далі канцэрт, на якім дэманстравалі свой фільм аб атрадзе, факультэце.

**30 ЛІПЕНЯ.**

Сёння быў сход атрада. Падвялі вынікі за першы месяц. Зроблена нямала: асвоілі 59 тыс. рублёў капіталаўкладанняў пры плане 35, агітбрыгадай дадзена 10 канцэртаў, прачытана 7 лекцый. Адным словам, атрад увайшоў у сваё рэчышча, ёсць усе магчымасці, каб... Загадваць не хочацца, але лічбы і зробленая справа радуюць. Гэта выказаў і начальнік арганізацыі М. В. Харытоненка, які таксама прысутнічаў на сходзе.

Мы ўжо, як кажуць, абжыліся. Усюды развешана наглядная агітацыя: газеты, «маланкі», плакаты. Працуе ленінскі пакой і свая бібліятэка, якую мы прывезлі з сабой і вырашылі падарыць 500 кніг мясцовай школе. Неад'емнай часткай атрада сталі дзеці. Без іх нават неяк сумна. Кіраўнік піянерскага лагера «Спадарожнік».

Алена Башун вельмі добра змагла арганізаваць работу, і дзеці ўжо за гадзіну да нашага прыходу з працы збіраюцца ў пакоі, які яны з гонарам называюць сваім. У іх свая бібліятэчка, сшыткі, алоўкі, фарбы. Яны вывешваюць на конкурс свае малюнкі. Дарэчы, сёння ў іх праходзіў чарговы конкурс. Пад сваё шэфства ўзялі яны магілу загінуўшых воінаў. Атрадны каляндар пад іх наглядам: кожны вечар мяняюць навіны і лічбы з маленькіх каменьчыкаў. Вялікую папулярнасць сярод моладзі пасёлка Лоухі набыла наша дыскатэка. Дыскатэчныя «чацвяргі» сталі традыцыйнымі. Іх мы праводзім у клубе, які мы самі афармілі. Арганізацыя часова перадала яго нам. Сёння нашы мастакі закончылі афармленне рабочага інтэрната.



**12 ЖНІЎНЯ.**

Дзень будаўніка. Сёння адбыўся злёт усіх атрадаў нашай зоны. Па падведзеных выніках мы занялі III месца ў сацыялістычным спаборніцтве. Дзень быў напружаны. У спаборніцтве па прафесіянальнаму майстэрству сярод прадстаўнікоў атрадаў I месца заняў Славік Шаўчук. Вельмі добра паказала сябе футбольная каманда, якая таксама заняла першае месца і дагэтуль не мела ніводнага пройгрышу. Трэцяе месца заняла агітбрыгада і зноў першае — насценная газета. Як раскрываюцца людзі! Проста дзіву даешся здольнасцям кожнага. Гэта заўважылі ўсе, толькі не паказваюць выгляду. На вачах мацнее калектыў атрада.

**19 ЖНІЎНЯ (НЯДЗЕЛЯ)**

Сёння былі на заліве Белага мора. Дзень прайшоў вельмі весела. Адпачылі і атрымалі зарад на будучы тыдзень. Пасля прыезду наша футбольная каманда гуляла з камандай атрада «Арсенал». Выйгралі.

**2 ВЕРАСНЯ.**

Сёння была апошняя лінейка. Працоўны семестр закончыўся, спушчаны флагі, і флагштокі сіратліва падперлі неба. Лета праляцела, нават ніхто не прыкмеціў, як надышоў верасень. Шкада развітвацца. Да дзіўнага не хочацца ехаць дадому. Прывыклі, як быццам тут і жылі. Нават надвор'е стаяла такое, як і ў нас, у Беларусі, толькі надаедлівыя камары напаміналі аб Карэліі. Дзеці сёння цэлы дзень былі з намі — дапамагалі збіраць і выносіць рэчы. Усё ўжо ў рукзаках, чамаданах, скрутках — у гадзіну ночы ад'язджаем дамоў. Лета дарма не прайшло, яно дало вельмі многае для будучай нашай прафесіі ўсім байцам, раскрыла іх здольнасці.



Падвялі вынікі за два месяцы: атрад асвоіў 152 тысячы рублёў капіталаўкладанняў (па дагавору — 70), дадзена 17 канцэртаў, прачытана 13 лекцый... Усяго пералічыць нельга. Вечарам у штабе атрада зазваніў тэлефон — званілі з занальнага штаба. Не паверылі: нас віншавалі з першым месцам...

**У. БЕЛЬСКІ,**
**камандзір будатрада імя У. Амельянюка.**

Беларускі універсітэт

18 кастрычніка 1979 г.
Заказ № 1626 АТ 10887

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19

В. а. рэдактара
В. П. ВАРАБ'ЁЎ